Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУКМ
_______________С.Л. Шпарло
"20" 10 2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД437/эвуч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
*1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-16 01 01-11 Духавыя інструменты (народныя)*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках), зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. № 78, вучэбнага плана БДУКМ па напрамку спецыяльнасці

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*І.А. Мангушаў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В.А. Немцава,* народна-інструментальнай музыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*А.Я. Крамко,* дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* духовой музыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 8 ад 21.04.2022);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 15.06.2022)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны дысцыпліна “Методыка выкладання спецдысцыплін” накіравана на фарміраванне ў студэнтаў комплекса ведаў, уменняў і навыкаў неабходных для атрымання кваліфікацыі “выкладчык”.

Вучэбная дысцыпліна “Методыка выкладання спецдысцыплін” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: “Педагогіка”, “Агульная псіхалогія”, “Сальфеджыо”, “Гармонія”, “Аналіз музычных форм і паліфонія”, “Спецінструмент”, “Дырыжыраванне” і інш. У сваю чаргу, веды.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* — фарміраванне асноў педагагічнага майстэрства па выкладанню спецыяльных музычных дысцыплін.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны*:

– фарміраванне комплексу ведаў, уменняў і навыкаў, якія забяспечваюць магчымасць плённай педагагічнай дзейнасці ў галіне музычнага мастацтва;

– засваенне сучасных прынцыпаў і тэхналогій сучаснай музычнай педагогікі і псіхалогіі мастацкай творчасці;

– азнаямленне студэнтаў з заканамернацямі і пэўнымі алгарытмамі, якія складаюць сутнасць методыкі выкладання музычных дысцыплін;

– авалоданне навыкамі работы па фарміраванню вучэбна-педагагічнага рэпертуара і спецыяльнай метадычнай літаратурай па пытанням музычнага мастацтва;

– актывізацыя прафесійнага інтарэсу да педагагічнай дзейнасці;

– далейшае ўдасканальванне прафесійных і агульных музычных здольнасцей студэнтаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ведаць

*ведаць:*

– спецыфічныя асаблівасці выкладання спецыяльных дысцыплін у розных тыпах навучальных устаноў, у дзіцячых і дарослых калектывах;

– методыку складання і аналіз вучэбных і канцэртных музычных праграм;

– асаблівасці методыкі работы над музычным творам на розных этапах;

– спецыфіку падрыхтоўкі вучня да канцэртнага выступлення, да выканаўчага конкурсу;

– вучэбны і канцэртны рэпертуар і сучасную метадычную літаратуру.

*Умець*:

– выкладаць музычныя дысцыпліны ў прафесійных і агульных установах музычнай адукацыі, выкарыстоўваць пры гэтым традыцыйныя і сучасныя методыкі;

– работаць з вучэбна-метадычнай літаратурай;

– праводзіць урокі розных відаў і тыпаў;

– вырашаць з вучнем канкрэтныя мастацкія і тэхнічныя задачы; планаваць вучэбны працэс з улікам узросту і ўзроўню падрыхтоўкі вучняў, паслядоўна развіваць у вучня музычныя здольнасці, прафесійныя ўменні і навыкі.

*Валодаць*

– прыёмамі работы з аўтэнтычнымі, жанрава-стылевымі і аўтарскімі сучаснымі музычнымі творамі для выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах;

– навыкамі пошука ў розных фондах музычных твораў, якія неабходна інструментаваць для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– спецыфікай выкарыстання эпізадычных музычных інструментаў у складзе сучасных ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– тэхнікай чытання партытур музычных твораў і аналіз склада ансамбля, аркестра, іх груп ці асобных інструментаў ў сучасных калектывах духавого мастацтва.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання спецдысцыплін” павінна забяспечыць фарміраванне спецыялізаваных кампетэнцый СК-3 Выкладаць спецдысцыпліны на высокім навукова-тэарэтычным узроўні, прымяняць метады і сучасныя методыкі навучання ігры на духавым народным інструменце; СК-4 Прымяняць веды у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці, панімаць інавацыйныя працэсы у адукацыі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання спецдысцыплін” усяго адведзена 90 гадзін, з якіх 34 гадзіны аудыторныя (22 гадзіны – лекцыіі, 12 гадзін – семінарскія) заняткі.

Рэкамнедаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЫРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ I. ТЭАРЭТЫКА-ПРАКТЫЧНЫЯ АСНОВЫ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ МУЗЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

### Тэма 1.1. Спецыяльныя дысцыпліны ў сістэме музычнай адукацыі

Вучэбная дысцыпліна "Методыка выкладання спецдысцыплін" сярод іншых вучэбных дысцыплін музычнага цыкла. Роля спецдысцыплін у падрыхтоўцы спецыялістаў духавога мастацтва Беларусі (гістарычныя і метадычныя аспекты). Вывучэнне спецдысцыплін як умова якаснай падрыхтоўкі высока кваліфікаваных выкладчыкаў (вучэбныя навучальныя установы культуры і мастацтваў; мастацкія калектывы устаноў культуры і ведамасных устаноў). Метадычныя аспекты, змест, асноўныя дакументы і патрабаванні па выкладанню спецдысцыплін на духавых інструментах у розных тыпах устаноў адукацыі. Крытэрыі, сістэма і асноўныя формы навучання і кантролю ведаў у працэсе атэстацыі навучэнцаў на іспытах. Значэнне і роля методыкі выкладання спецдысцыплін у працэсе фарміравання педагагічнага і выканальніцкага майстэрства выкладычыка.

### Тэма 1.2. Асноўная вучэбна-метадычная літаратура па спецыяльных дысцыплінах

Станаўленне і развіццё методыкі выкладання спецыяльных музычных дысцыплін. Сувязь методыкі з гісторыяй выканальніцтва на музычным інструменце і гісторыяй музычнага мастацтва. Вывучэнне матэрыялаў аб правядзенні конкурсаў музычнага мастацтва, іх сутнасць і роля ў працэсе актывізацыі ажыццяўлення тэарэтычных даследванняў аб выканальніцкіх сродках музыканта. Выкарыстанне прагрэсіўных методык у працэсе выкладання спецыяльных музычных дысцыплін.

Агляд сучаснай вучэбна-метадычнай літаратуры.

Асноўныя вучэбна-метадычныя дапаможнікі. Структура і змест вучэбна-метадычных дапаможнікаў (школы ігры, хрэстаматыі, зборнікі педагагічнага і канцэртнага рэпертуара і інш.).

Праблемы фарміравання бібліятэчных фондаў спецыяльнай і нотнай літаратуры для духавых і ударных інструментах у розных тыпах навучальных устаноў культуры і мастацтваў.

### Тэма 1.3. Дыягностыка і метады развіцця музычных здольнасцей навучэнцаў

Агульныя і спецыяльныя музычныя здольнасці. Музычны слых – адзін з асноўных кампанентаў музыхных здольнасцей. Музычная памяць – здольнасць успрымання зместу і формы музычнага твора. Дыягностыка здольнасцей навучання на духавых інструментах у пачатковых навучальных установах. Асноўныя крытэрыі адбору навучэнцаў на духавых і ударных інструментах у сярэднія спецыяльныя навучальныя установы. Развіццё рытмічнага пачуцця як арганізаванай паслядоўнасці музычных гучанняў рознай працягласці і пауз.

Метады вызначэння музычных здольнасцей. Выяўленне здольнасцей у працэсе музычнай дзейнасці.

Метады развіцця музычных здольнасцей у класе па адпаведным спецдысцыплінам.

Сістэма арганізацыі заняткаў і асаблівасці выкладання ў класе спецінструмента, дырыжыравання, аркестравага класа, класа інструментальнага ансамбля.

## РАЗДЗЕЛ ІІ. ТЭХНАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ НАВУЧАННЯ ПЕДАГАГІЧНАМУ І ВЫКАНАЛЬНІЦКАМУ МАЙСТЭРСТВУ

### Тэма 2.1. Састаўныя кампаненты выканальніцкага апарата музыканта

Выканальніцкі апарат музыканта як зыходная пастаноўка корпуса і рук музыканта. Агульныя прынцыпы пабудовы выканальніцкага апарата (у адпаведнасці са спецыялізацыяй). Асноўныя заканамернасці работы мышцаў і анатама-фізіялагічная будова рук. Роля індывідуальных асаблівасцей вучня пры вызначэнні пастаноўкі.

Спецыфіка пасадкі, становішча інструмента і пастаноўкі рук. Роля выканальніцкага апарата ў фарміравання якаснага гучання інструмента. Паступовасць і паслядоўнасць у набыцці навыкаў ігры.

Методыка засваення ферматы, акцэнтаў, сінкоп і спосабы іх выражэння ў дырыжорскам жэсце. Асаблівасці выкарыстання дырыжорскай палачкі ў выканальніцкім працэсе (тэорыя, гісторыя, практыка). Методыка засваення разнавіднасцю штрыхоў і іх адлюстраванне ў дырыжорскам жэсце. Дынаміка і яе адлюстраванне ў дырыжорскам жэсце.Асноўныя метадычныя прынцыпы

работы дырыжораў з партытурай. Метадычныя рэкамендацыі пры выяўленні дырыжорам выбара схем тактіравання.

## Тэма 2.2. Методыка засваення асноўных мастацка-выразных сродкаў музычнага выканальніцтва

Дынаміка-акустычныя асаблівасці фарміравання гуку на духавых і ўдарных інструментах. Сродкі гуказдабывання на духавых і ўдарных інструментах. Слыхавы кантроль над гуказдабываннем і сувязь яго з музычна-мастацкім прадстаўленнем. Гукавая дынаміка, гукавыя дыяпазоны інструментаў. Тэмбравае фарбаванне гуку. Артыкуляцыйныя магчымасці выканаўцы ў працэсе засваення інструмента. Штрыхі і прыемы гуказдабывання. Класіфікацыя штрыхоў. Асноўныя метады засваення і выкарыстання асноўнай і дадатковай аплікатуры.

Развіццё выканальніцкай тэхнікі ў аркестравым класе, класе спецінструмента, класе дырыжыравання, класе інструментальнага ансамбля і методыка работы над інструктыўным матэрыялам. Роля інструктыўнага матэрыяла для тэхнічнага і мастацкага развіцця музыканта.

## Тэма 2.3. Методыка вывучэння і асаблівасці засваення вучэбнага і канцэртнага рэпертуару

Методыка адбора, вывучэння, аналіза вучэбнага і канцэртнага рэпертуару (у адпаведнасці са спецыялізацыяй). Агульныя метадычныя прынцыпы адбору і сістэматызацыі рэпертуару ў аркестравым класе, класе спецінструмента, класе дырыжыравання, класе інструментальнага ансамбля класе спецінструмента. Творы розных стыляў і жанраў у вучэбным і канцэртным рэпертуары. Асноўныя прынцыпы інтэрпрэтацыі, пералажэння, інструментоўкі музычных твораў (выканальніцкія і метадычныя аспекты).

Методыка фарміравання канцэртнага рэпертуару як сродка выхавання выканальніцкага майстэрства.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № п/п | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | УСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія | | |
| *Радзел І. Тэарэтыка-практычныя асновы методыкі выкладання спецыяльных музычных дысцыплін* | | | | | |
| 1. | Тэма 1.1. Спецыяльныя вучэбныя дысцыпліны ў сістэме музычнай адукацыі | 2 | | | |
| 2. | Тэма 1.2. Асноўная вучэбна-метадычная літаратура па спецыяльных дысцыплінах | 2 | 1 | 2 | апытванне |
| 3 | Тэма 1.3. Сутнасць і змест сучасных выканальніцкіх школ | 2 | 2 | | |
| 4. | Тэма 1.4. Дыягностыка і метады развіцця музычных здольнасцей навучэнцаў | 4 | 2 | 2 | тэст |
| *Радзел ІІ.Тэхналагічныя аспекты навучання выканальніцкаму майстэрству* | | | | | |
| 5. | Тэма 2.1. Састаўныя кампаненты выканальніцкага апарата музыканта | 2 | 1 | | |
| 6. | Тэма 2.2. Методыка засваенне асноўных мастацка-выразных сродкаў музычнага выканальніцтва | 2 | 2 | | |
| 7. | Тэма 2.3. Методыка вывучэння і асаблівасці засваення вучэбнага і канцэртнага рэпертуару | 4 | 2 | 2 | апытванне |
| | **Усяго: 34** | **18** | **10** | **6** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ ПА ВЫВУЧЭННЮ КУРСА “МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІН”

### *Асноўная літаратура*


1. Абдуллин, Э. Б. Теория музыкального образования : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по направлению подготовки 44.03.01 - "Педагогическое образование, профиль "Музыка" ; 44.03.05 Педагогическое образование (с двумя профилями подготовки) Музыка и дополнительное образование (в области музыкального искусства) / Э. Б. Абдуллин, Е. В. Николаева. - 3-е изд., перераб. и доп. - Москва : Прометей, 2020. - 500, [1] с.
2. Байбикова, Г. В. Основы музыкально-педагогического общения : учеб.-метод. пособие для студентов высших учебных заведений, обучающихся по направлению подготовки "Музыкально-инструментальное искусство" / Г. В. Байбикова. - 3-е изд., стер. - Санкт-Петербург ; Москва ; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2018. - 128, [2] с.
3. Бодина, Е. А. Музыкальная педагогика и педагогика искусства. Концепции XXI века : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным напрвлениям / Е. А. Бодина. - Москва : Юрайт, 2021. - 333 с.
4. Кофлер, Л. Искусство дыхания как основа звукоизвлечения : учеб. пособие / Лео Кофлер ; пер. с англ. Е. В. Вербицкой. - Санкт-Петербург ; Москва ; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2019. - 319 с.
5. Яконюк, Н. П. История и теория исполнительства на народных инструментах : учеб.-метод. комплекс / Н. П. Яконюк, О. А. Немцева. - Минск : БГУКИ, 2021. - 152 с.


### *Дадатковая літаратура*


1. Архангельский, И.П. Организация духовых оркестров и обучение игре на духовых инструментах : метод. реком. для руководителей самодеятельных духовых оркестров и преподавателей ДМШ /
2. Асафьев Б.В. Избранные статьи о музыкальном просвещении и образовании / Б.В.Асафьев. – М.: Музыка, 1965.– 144 с.
3. Ауэр Л.С. Моя школа игры на скрипке. Интерпретация произведений скрипичной классики / Л.С.Ауэр. – М.: Музыка, 1965.– 272 с.
4. Блох, О.А. Психология и педагогика музыкального творчества: Уч. пос. — М.: МГУКИ, 2009. — 270 с.

духовые инструменты: труба, корнет, альт горн, тенор горн, баритон горн) : метод. указания с нотными примерами / А. Л. Коротеев. – Мн. : Минск. ин-т культуры, 1986. – 40 с.

19. Коротеев, А. Л. Самостоятельные ежедневные упражнения на специнструменте как составная часть учебного процесса (медные духовые инструменты: труба, корнет, альт горн, тенор горн, баритон горн) : метод. указания с нотными примерами / А. Л. Коротеев. – Изд. 2-е. – Мн. : Минск. ин-т культуры, 1985. – 36 с.

20. Коротеев А.Л. Актуальные проблемы методики работы с ансамблями и оркестрами духовых и ударных инструментов (профессиональные и любительские коллективы) / А.Л. Коротеев // Оркестр. – № 1. – 2005 г. – С. 11-13.

21. Коротеев А.Л. Взаимосвязь традиций народной педагогики и современных дидактических принципов в системе подготовки национальных музыкантов / А.Л. Коротеев // Социально-гуманитарные науки и устойчивое развитие белорусского общества: материалы Междунар. науч. конф., г. Минск, 9 декабря 2005 г. /. – Мн.: БИП, 2005. – С. 236-237.

22. Корыхалова, Н.П. Музыкально-исполнительские термины: Возникновение, развитие значений и их оттенки, использование в разных стилях. — СПб.: Композитор, 2000. — 272 с.: нот.

23. Караткевіч, А.А. Педальныя гукі у сістэме штодзённых самастойных заняткаў трубача. Вучэбны матэрыял / А.А. Караткевіч. – Мн.: БУК, 1977. – 17 с.

24. Караткевіч, А.А. Развіццё асноўных выканаўчых навыкаў на пачатковым этапе навучання ігры на трубе / А.А. Караткевіч // Праблема ўдасканадення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі. Тэзісы дакладаў на навукова-метадычнай канферэнцыі (2 – 3 лютага 1995 г.). – Мн.: БУК, 1995. – 37 с.

25. Карацееў, А.Л. Забеспячэнне працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ культуры і мастацтваў Беларусі (вучэбна-метадычныя і арганізацыйныя аспекты) / А.Л. Карацееў // Кафедра як асноўны цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў да дзейнасці ў сацыякультурнай і інфармацыйна-камунікатыўнай сферах: Матэрыялы навук.-метад. Канф. (19-20 лютага 2004 г.) / Рэдкал.: Смолік А.І. (адк. Рэд.) і інш. – Мн.: Бел. дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 51-54.

26. Карацееў, А.Л. Роля прагрэсіўных тэхналогій падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў працэссе распрацоўкі сучасных адукацыйных стандартаў / А.Л. Карацееў // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты:

Матэрыялы навук.-метад.-канф. (2-3 лютага 1999г.). – Мн. Бел.Ун-т културы, 1999. – С 91-96.

27. Мангушаў І. А. Праблемы навучання гукаўтварэнню, штрыхам на медных духавых інструментах удзельнікаў аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў / І. А. Мангушаў // Асаблівасці дзейнасці аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў і ансамбляў на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры Беларусі: навучальна-метадычны дапаможнік. – Мн.: БУК, 1994. – С. 22–25.

28. Мангушев И. А. Ступени мастерства трубача. Учебно-методическое пособие / И. А. Мангушев; вступ. ст. А. Л. Коротеева. – Мн. : БелГИПК, 2001. – 68 с. : нот. ил.

29. Степурко, О. Трубач в джазе. /О.Степурко – М.: Советский композитор, 1989. – 207 с.

30. Табаков, М.И. Ежедневные упражнения для трубы / М.И.Табаков – М.-Л.: Музыка, 1952. – 30 с.

31. Холопова, В. Вопросы ритма в творчестве композиторов XX века / В.Холопова. – М.: Музыка, 1971.

32. Усов, Ю.А. Методика обучения игры на трубе / Ю.А.Усов. – М.: Музыка, 1984. – 215 с.

33. Усов, Ю.А. Техника современного трубача (ежедневные упражнения) / Ю.А.Усов. – М.: Музыка, 1986. – 86 с.

34. Цыпин Г. Исполнитель и техника. / Г. Цыпин – М.: Музыка, 1999.

35. Яконюк, В.Л. Музыкант. Потребность. Деятельность. / В.Л. Яконюк. – Минск,1993. – 227 с.

## *Метады і тэхналогіі навучання*

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін” ажыццяўляецца з выкарыстаннем розных метадаў:

- тэарэтычных і агульналагічных (сістэматызацыі, класіфікацыі, параўнальнага аналізу, сінтэзу, абагульнення);
- эмпірычнага (назірання, апісанні, аналізу аўдыё- і відэаматэрыялаў, аналізу канцэртных праграм);
- тлумачальна-ілюстрацыйнага ў спалучэнні з рэпрадуктыўным.

На лекцыйных і практычных занятках мэтазгодна прымяняць інтэрактыўныя метады навучання: работу з дыдактычнымі матэрыяламі, дыскусіі і абмеркаванні, разбор канкрэтных вучэбна-метадычных сітуацый, праектаванне навучальных заняткаў і г. д. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій навучання тэлекамунікацыйных сетак) дазволіць зрабіць аўдыторныя заняткі цікавейшымі і эфектыўнымі. Сярод форм ужывання кампутарных тэхналогій – дэманстрацыя мультымедыйных прэзентацый, праслухоўванне і прагляд аўдыё- і відэаматэрыялаў, праца з рэсурсамі сеткі Інтэрнэт, электроннымі энцыклапедыямі і інш. Важным уяўляецца і ўлік міждысцыплінарных сувязяў. Пастаянны зварот да іншых тэарэтычных і практычных дысцыплін дазволіць растлумачыць навучальны матэрыял і замацаваць заняткі, якія засвойваюцца студэнтамі.

## *Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай працы студэнта*

Самастойная работа студэнтаў садзейнічае паглыбленню іх ведаў, пашырэнню кругагляду, фарміраванню навыкаў самастойнага пошуку і апрацоўкі інфармацыі, выпрацоўцы творчага падыходу да асваення тэарэтычнага і практычнага матэрыялу па тэмах вучэбнай дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў у рамках вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін” уключае ў сябе наступныя формы:

- вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу навучальнай дысцыпліны;
- выкарыстанне відэа-і аўдыёматэрыялаў;
- падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў і іспыту.

Вывучэнне матэрыялу навучальнай дысцыпліны мае на ўвазе працу студэнтаў з канспектам лекцый, друкаванай літаратурай і рознымі інфармацыйнымі рэсурсамі сеткі Інтэрнет. Вывучэнне і складанне канспекта дадатковых матэрыялаў па індывідуальным спісе (з улікам базавай адукацыі).

Выкарыстанне відэа- і аўдыёматэрыялаў – адна з важных форм самастойнай працы ў рамках навучальнай дысцыпліны “Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін”. Яно заключаецца ў пошуку, праглядзе, праслухоўванні і аналізе выступленняў розных калектываў і майстар-класаў вядомых выканаўцаў і педагогаў-духавікоў.

Падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў і іспыту патрабуе адказных адносін і рэгулярнай працы над замацаваннем ведаў, атрыманых падчас аўдыторных заняткаў, творчага падыходу (выкананне практычных заданняў пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў), а таксама глыбокага вывучэння студэнтамі рэкамендаванай асноўнай і дадатковай літаратуры. У працэсе самастойнай працы студэнт падбірае прыклады (якія дазваляюць праілюстраваць асаблівасці выканальніцкай тэхнікі, спецыфікі трактоўкі і розныя выканальніцкія школы для духавых інструментаў), практыкаванні для правільнай пастаноўкі дыхання, сістэматызуе спосабы працы над інструктыўным матэрыялам, падбірае практыкаванні для развіцця выканальніцкай тэхнікі.

### ***Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі***

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

- вуснае апытанне падчас заняткаў;
- выступленне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах;
- творчыя заданні (падрыхтоўка прэзентацый па асобных раздзелах дысцыпліны; падбор ілюстрацыйнага матэрыялу);
- выкананне практычных заданняў (падбор метадычных матэрыялаў па асобных тэмах дысцыпліны; паказ практыкаванняў для развіцця выканальніцкага майстэрства; падбор вучэбнага і канцэртнага рэпертуару; складанне канцэртных праграм і г. д.).